Бешанковіцкі раёны выканаўчы камітэт
Інстытут гісторыі НАН Беларусі
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

запрашаюць прыняць удзел у

НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

«БЕШАНКОВІЦКІ КРАЙ: ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА РЭГІЁНА (да 100-годдзя Бешанковіцкага раёна)»

г.п. Бешанковічы, 20–21 чэрвеня 2024 г.

Праблемнае поле канферэнцыі:

- ❖ Гісторыя і культура Бешанковіцкага краю.
- ❖ Археалагічныя і этнаграфічныя даследаванні Бешанковіччыны.
- ❖ Ваенныя падзеі на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна.
- ❖ Турыстычны і краязнаўчы патэнцыял Бешанковіцкага краю.
- ❖ Звязаны лёсам з Бешанковіччынай: Ц. С. Гарбуноў, Л. М. Даватар, А. Ц. Караткевіч, Леў Сапега, Іахім Храптовіч, І. Ф. Хруцкі, С. Б. Юдовін і інш.

Мовы канферэнцыі: беларуская, руская.

Умовы ўдзелу: для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна не пазней за **20 мая 2024 г.** накіраваць на электронны адрас аргкамітэта **vitebshchina@mail.ru** заяўку з указаннем наступных звестак: прозвішча, імя, імя па бацьку; вучоная ступень, званне (пры наяўнасці); месца работы; тэлефон; e-mail; тэма даклада; форма ўдзелу (вочная ці завочная). *Удзельнік канферэнцыі, які дае гэтыя звесткі, тым самым пагаджаецца на апрацоўку персанальных даных.*

Звяртаем Вашу ўвагу:

- матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваныя;
- тэрмін прадстаўлення артыкулаў для публікацыі ў зборніку – да **1 жніўня 2024 г.**;
- аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заявак для ўдзелу ў канферэнцыі і тэкстаў дакладаў для публікацыі. Аргкамітэт не тлумачыць прычыны магчымага адхілення заявак і тэкстаў дакладаў.

Патрабаванні да афармлення дакладаў:

Электронны варыянт не больш за 30 000 знакаў. Першы радок – імя і прозвішча, горад. Другі радок – назва даклада. Асноўны тэкст Times New Roman, 14 кегль, палутарны міжрадковы інтэрвал. Абзацны водступ – 1,25 см. Спасылкі на кожнай старонцы, нумарацыя спасылак скразная. Спасылкі афармляюцца па СТБ 7.208-2008. Тып файла – doc ці rtf (Microsoft Word). Ілюстрацыі дасылаюцца асобнымі файламі.

Каардынатары:

Бараноўскі Аляксандр Віктаравіч, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук. Тэл. (+375 17) 270-04-22. E-mail: *a.baranouski@belcentre.by*.

Перавалава Наталля Юр'еўна, вучоны сакратар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук. E-mail: *n.peravalava@gmail.com*

Правілава Дар'я Дзмітрыеўна, малодшы навуковы супрацоўнік сектара навукова-інфармацыйнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, магістр мастацтвазнаўства E-mail: *dariya.pravilova@mail.ru*

Трансфер па маршруце Мінск – Бешанковічы – Мінск будзе ажыццяўляцца арганізатарамі канферэнцыі. Пражыванне і харчаванне за кошт прымаючага боку.

Узор афармлення тэксту даклада

Кірыл Анікіевіч *(Магілёў)*
1 інтэрвал
НАЗВА
1 інтэрвал
Тэкст... Текст... Текст... Текст... Текст... Текст... Текст... Текст... Текст... Текст... Текст... Текст...